рамеснай вытв-сці, яе спецыялізацыі і арганізацыйнаму ўпарадкаванню на Беларусі садзейнічала магдэбургскае права. У 2-й пал. 16 — 1-й пал. 17 ст. ў Магілёве, Віцебску, Полацку, Слуцку, Пінску, Брэсце, Мінску, Гродне існавала 50—80 відаў Р. Найб. пашыранымі былі тыя, вырабы якіх карысталіся попытам сярод шырокіх слаёў насельніцтва: кавальскае, кравецкае, шавецкае, гарбарнае, цяслярскае, ганчарнае Р. ў горадзе, розныя віды дрэваапрацоўкі (выраб с.-г. прылад, посуду, мэблі, цяслярства), апрацоўка воўны і лёну, ткацтва ў вёсцы. Больш выразны падзел працы і актыўныя гандлёва-эканам. сувязі горада абумовілі паскарэнне тэхн. ўдасканалення і ўзнікненне некаторых асаблівасцей сац.-эканам. арганізацыі гарадскога Р. Гарадскія рамеснікі аб'ядноўваліся ў асобныя прафес. карпарацыі — рамесныя цэхі, куды часам уваходзілі таксама майстры, якія жылі на землях феад. юрыдык. Спачатку такія карпарацыі наз. брацтвамі (Брэст, Гродна, Мінск, Вільня), радзей староствамі (Магілёў, Полацк). У пач. 19 ст. цэхавае Р. канчаткова вычарпала свае магчымасці і паступова было выціснена мануфактурнай формай вытворчасці. Ва ўмовах капіталіст. канкурэнцыі адбылася дэвальвацыя ручной працы, што парушыла традыц. гармонію Р. і мастацтва. У канцы 19 — пач. 20 ст. адбыліся прыкметныя перамены ў структуры рамесніцтва. Развіццё капіталіст. прам-сці адмоўна адбілася на становішчы такіх традыц. Р., як ганчарства, ткацтва, звузіліся маштабы вышыўкі, амаль знікла майстэрства фарбавання тканін — набойка і інш. Пасля Кастр. рэв. саматужна-рамесная вытв-сць разглядалася як адна з форм пераходу да новай сацыяліст. індустрыі. У сферы грамадскай вытв-сці буйная прам-сць гістарычна заканамерна адцясніла Р. на другараднае месца. Аднак канчаткова яно не знікла, астаючыся і ў наш час не толькі эканамічна апраўданым як дапаможны промысел, але і як нар. мастацтва, як майстэрства ўмелых рук. Вырабы ўмельцаў і таленавітых нар. майстроў вызначаюцца самабытнасцю і эстэт. густам, тонкім адчуваннем фактуры матэрыялу, дакладнасцю выканання (гл. *Бандарныя вырабы, Ганчарства, Коўка мастацкая, Ліццё мастацкае, Такарныя мастацкія вырабы, Тканіны мастацкія*). Традыцыі нар. Р. захаваліся ў *народных мастацкіх промыслах*, сталі неад'емнай часткай сучаснай бел. культуры, крыніцай творчасці для прафес. мастацтва.

*Літ.:* Титов В. С. Народные деревообрабатывающие промыслы Белоруссии (1917—1941 гг.).— Мн., 1976; Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество.— Мн., 1981; Милюченков С. А. Белорусское народное гончарство.— Мн., 1984; Промыслы і рамёствы Беларусі.— Мн., 1984.

*В. С. Цітоў.*

**РАН** Лазар Саулавіч [н. 23.3(5.4).1909, г. Даўгаўпілс Латв. ССР], беларускі сав. графік, жывапісец. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1932). У маст. выстаўках удзельнічае з 1934. Творам Р. уласцівы эмацыянальнасць, жыццёвая праўдзівасць, тонкі псіхалагізм. Выканаў серыі афортаў «Брэсцкая крэпасць» (1952), «Мінскае гета» (1970). Значнае месца



Л. Ран. Сустрэча ў Вільні. 1980.

ў творчасці Р. займаюць вобразы Я. Коласа і Я. Купалы: альбомы афортаў «Мой родны кут, як ты мне мілы...» (1958—60) і «Па родных мясцінах Я. Купалы» (1970), партрэт П. Мядзёлкі (1970), жывапісныя палотны «Я. Колас у Навагрудку» (1960), «Сустрэча ў Вільні» (1980), «Я. Купала і Цётка каля Чорнага возера» (1983) і інш. Аўтар жывапісных сюжэтна-тэматычных карцін «Акупанты» (1938), «Сям'я Ульянавых» (1952), «Дзядуля-герой» і «Звесткі з Петраграда» (1957), «Сталявары» (1958), «Беларуская легенда» (1960), «Перад уборкай ураджаю ў калгасе імя Я. Коласа» (1963) і інш., партрэтаў Героя Сав. Саюза Г. І. Маслоўскай і камісара партыз. атрада У. Е. Краіко (1945), прафесара Л. М. Нікапава (1948), беларускага асветніка Ф. Скарыны (1963) і інш. Іл. гл. таксама ў арт. *Афорт, Лeнініяна.*

*Літ.:* Ран Лазар Саулавіч / Скл. і аўт. тэксту Р. Шаура.— Мн., 1975.

*Р. Ф. Шаура.*

**РА́НДАЎ** (Randow) Норберт (псеўд. Т. Н. Брарон; н. 27.11.1929, Нойштрэліц, ГДР), нямецкі перакладчык, літаратуразнавец. Скончыў Берлінскі ун-т (1953), у 1955—62 выкладаў балгарскую л-ру ў ім. Перакладае з бел., рус., балг. і інш. славянскіх моў. У 1974 наведаў Мінск. Пераклаў на ням. мову апавяданні М. Багдановіча, М. Гарэцкага, К. Каганца, М. Чарота; аповесці (разам з Г. і У. Чапегамі) В. Быкава «Абеліск» (1975), «Здрада» (1978), А. Кудраўца «Радаўніца» (1983). Пераклады Р. адметныя глыбокім пранікненнем у сутнасць твора, дакладным